**ТВОРЧАСЦЬ А. ЖДАНАВА ЯК УЗОР АМАТАРСТВА Ў МАСТАЦТВЕ АНДЭГРАЎНДУ БЕЛАРУСІ КАНЦА ХХ СТ.**

*Л.У. Вакар*
*Віцебск, ВГУ імя П.М. Машэрава*

У мастацтве другой паловы ХХ – пачатку ХХІ ст. суадносіны паміж прафесійным, аматарскім, інсітным відамі творчасці з’яўляюцца вельмі сціслымі. Асабліва гэта заўважна у плыні андэграўнду, які функцыянуе як субкультура, і сярод яго аўтараў значную ролю. як арганізатараў і нават лідараў, выковаюць мастакі аматары. Адным з найбольш яркіх творцаў беларускага андэграўнду 1980-х гг. з’яўляўся Аляксей Жданаў (1948-1993), філосаф, паэт і мастак. Яго жывапіс, адметны па зместу і стылю, дэманструе сінтэз канцэптуальнасці і наіўнай выяўленчай формы. У другой палове 1980-х гг. ён быў актыўным удзельнікам мастацкіх акцый, скіраваных на актуалізацыю творчасці М. Шагала, К. Малевіча, якія былі здзейснены ў Мінску. Віцебску ды іншых гарадах.

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца вызначэнне стылістычнай асновы творчасці А. Жданава, раскрыццё яе значнасці для гісторыі мастацтва Беларусі ХХ стагоддзя.

**Матэрыял і метады.** Матэрыяламі для дадзенага артыкула з’яўляюцца творы А. Жданава з прыватных калекцый, а таксама публікацыі па яго творчасці. У якасці метадалогіі скарыстаны комплексны падыход, дзе спалучаюцца біяграфічны, апісальны і фармальна-стылістычны аналізы.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Вучыўся А. Жданаў на філасофскім аддзяленні гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, аднак быў выключаны за парушэнне вучэбнага графіка. Пасля вяртання з войску спрабаваў закончыць ўніверсітэт, але паэзія і прага новых ураженняў аказаліся больш значнымі для творцы. Праца ў будаўнічых арцелях ў Якуціі і на Калыме дала магчымасць паглыбіцца ў тэму сталінскіх рэпрэсій і жыццё асуджаных у Гулагу не толькі паводле твораў Варлама Шаламава, а і праз уласныя даследаванні. Яны сталі асновай для напісання цыкла калымскіх вершаў, якія шырока распаўсюджваліся ў Мінску праз “самвыдат”. У выніку такой папулярнасці на пачатку 1980-х гг. А. Жданаў, як і многія дысідэнты, быў здадзены на прымусовае лячэнне ў псіхіятрычную бальніцу. У 1980-я гг. ён напісаў п’есу “Бабуля праездам” (у сааўтарстве з Н. Татур), якая была пастаўлена на сцэне Рускага тэатра ў Таліне.




Рисунок 1, 2 – А. Жданаў Аўтапартрэт. канец 1980-х гг.;
А. Жданаў Горад Канец 1980-х гг.

З калымскай вандроўкі ў мастака засталіся ў памяці, а потым былі рэалізаваны ў творчасці дзіўныя ландшафтныя краявіды: на цёмным фоне вяршыні гор, з якіх сыходзіць святло (“Горы”, 1991) і паступова зліваецца з мноствам агеньчыкаў горада ў нізіне (“Калымскі пейзаж”, 1991). А. Жданаў нарадзіўся на Калыме, а ў гадавалым узросце бацькі прывезлі яго ў

Мінск. Таемнае свячэнне калымскіх краявідаў стала асобнай тэмай (“Гістарычная радзіма”, 1991), якая прыўнесла ў яго творы метафізіку святла, вызначыла адметнасці жывапісу, пабудаванага на градацыях тонаў. На карціне “Пахмурны ранак” (1989) горы, лес, людзі высвечваюцца з цемры нібы прывіды. Эфект негатыўнай выявы забяспечыў карцінным вобразам мастака характар паралельнага свету.

З сярэдзіны 1980-х гг. А. Жданаў плённа займаецца выяўленчай творчасцю, знаёміцца з аўтарамі неафіцыйнага мастацтва, прымае актыўны ўдзел у выставах аб’яднанняў “Форма”, “Плюраліс”, “Corvus Caecus” (“Белая варона”). Пачынае мастак з маргінальнай тэхнікі калажа, якая заўсёды была характэрна для аматарскай творчасці, так як не патрабуе валодання акадэмічным малюнкам. Калажныя творы А. Жданава вылучаюцца эклектычнасцю, якая набліжае іх да дадаізму. Ён збірае разнастайныя вобразы прыроды і цывілізацыі, мастацтва і побыту, класічных твораў і газетна-часопісных фотаздымкаў, выявы славутасцей, партрэты сяброў ды свой уласны ў адну кампазіцыю, якая дэманструе калейдаскапічную карціну яго светабачання.



Рисунок 3 – А. Жданаў. Землятрус. Канец 1980-х гг.

Асваенню жывапіснай тэхналогіі дапамаглі ўрокі ў В. Яўсеева і В. Мартынчыка [1, с. 14.]. Аднак па сведчанню яго родных і сяброў мастак добра маляваў з дзяцінства і ўмеў стылізаваць выяву адпаведна творчай мэце. Практычна ўсе жывапісныя творы ўвасабляюць вобразы вялікагаловых “мутантаў” на фоне эпічных горных, гарадскіх альбо лясных краявідаў. “Ягоны брутальны – зместам і формай – жывапіс рэальна адпавядаў грамадскім настроям і быў свайго роду выяўленчай версіяй актуальнай тады літаратурнай чарнухі. Жданаўскія істоты ў роўнай ступені маглі быць і прыхаднямі, што сышлі з лётаючых талерак, і бамжамі, што выпаўзлі з бруднага завуголля. Манера жывапісу – падкрэслена няўклюдная. Карціны агрэсіўныя да гледача, але мастак і не імкнецца да дыялогу. Сваёй місіяй Аляксей Жданаў нагадвае мне вешчуна, які прамаўляе камяням у пустэльні” – піша П. Васілеўскі [2, с. 4].

У празаічных тэкстах А. Жданава выкладаецца гісторыя пра прышлых “марсіян”, якія паядаюць духоўную субстанцыю выраджанага чалавецтва – “немцаў”. Суіснуюць гэтыя два народы ў выніку “біокубацэнозу” (тэрмін А. Жданава) на кубічнай Зямлі, якая мае не форму глобуса, а кубаса, і не круціцца яна, а “каціцца сабе кубарам”. Адпаведна зададзенай канцэпцыі мастак стылізуе ў жывапісе выявы мутантаў. Практычна ўсе яны маюць кубізаваныя формы галавы і прыбліжаныя да прамакутніка вочы. “Гэтая непаўторная прымітывісцкая адкрытасць, як правіла, прыпадабняецца да выявы-негатыва, ужываецца шчымлёва бедная палітра, што як бы дазіруе спантаннасць абсурду, дзе пераважае манатоннасць, і выключаны хоць якія імітацыі, магутна працуюць фактары, што падкрэсліваюць брутальнасць эстэтыкі, выявы быццам распластаныя на плоскасці; мутанты заўсёды паказваюцца ў фас, пластыка да бязглуздасці

простая: твары-маскі з чорнымі, непрапарцыянальна вялікімі вачніцамі, даведзеныя да знакавасці …” – характарызуе стыль А. Жданава Людміла Русава [3, с. 45].

Пры даволі аднатыпным пагрудным і анфасным выяўленні сваіх персанажаў відавочны розныя псіхалагічныя характары і эмацыянальныя настроі. “Мутант Сямёнаў” (1990) гіпнатызуе гледача шырока адкрытымі вачамі з чырвонымі зрэнкамі, яго драпежны паўраскрыты рот напоўнены каменьчыкамі дробных зубоў. У “Кампазіцыі з сям’ю постацямі” (1992) ціхмяныя персанажы з вялізнымі лбамі і дробнымі баязлівымі вочкамі з насцярожанасцю выглядаюць з цёмнай прасторы карціны, галовы крайніх не змясціліся ў фармаце і вытыркнуліся з бакоў, нібы з-за шырмы.

Палатно “Жыхары гораду” (1992) мае кампазіцыйнае вырашэнне, прыбліжанае да маляванага дывана: сярэднік у форме аркі і бардзюр з выявай высокіх дрэўцаў. На першым плане ў прыгожых аранжава-чырвоных строях дадзены пагрудныя выявы мужчыны і жанчыны на фоне гарадского краявіду і гарыстага далягляду. Высока ў небе строга па цэнтры змешчаны жоўты шар поўні, што ў дыванковай паэтыцы азначае паўнату жыцця. Царскае аблічча мужчыны і замілаваны погляд жанчыны адсылаюць да гратэскнай традыцыі лубка.

Пейзажныя фоны большасці карцін маюць эсхаталагічны характар: ва ўрбаністычным краявідзе высокія вежы нахілены нібы пры землятрусе (“Самота”, 1990), прамакутныя сеткі шматпавярховых дамоў спалучаюцца з крыжамі могілак (“Яны прышлі”, 1990), барвовыя з попелам аблокі шчыльна засцілаюць неба над горадам (“Вечны горад”, 1992). На палатне “У начным ззянні” (1991) постаці мутантаў з запытальнымі выразамі твараў уздымаюцца з вялізнай магілы, іх шэсце нагадвае паўстанне мёртвых. У дадзеных матывах можна асацыятыўна разгледзіць вобразы ахвяр сталінскіх рэпрэсій, жах Чарнобыльскай аварыі ды іншыя трагедыі ХХ стагоддзя.

**Заключэнне.** А. Жданаў у кожнай новай працы імкнуўся нагадаць грамадству пра яго гісторыю, раскрыць утоеныя жахі і тым самым дапамагчы пазбавіцца ад бяспамяцтва. Няглядзячы на аматарскі характар жывапісу, яго творы займаюць выключнае месца у выяўленчым мастацтве Беларусі канца ХХ стагоддзя. Яго творчасць з’яўляецца крытычным раскрыццём ідэалогіі таталітарызму, што даволі рэдка можна сустрэць у афіцыйным мастацтве. У сваёй стылістыцы мастак актыўна спажывае тэхнікі і прыёмы дадаізму, неапрымітывізму і неаэкспрэсіянізму.

1. Аляксей Жданаў : альбом / уклад. А. Клінаў; уступ. тэкст Дз. Строцаў. – Менск : Выдавец І. П. Логвінаў. – 2013. – 120 с.
2. Васілеўскі, П. Мастак адвечнай мерзлаты / П. Васілеўскі // Мастацтва. – 2013. – № 03. – С. 4.
3. Русава, Л. Наводзіць жах на рабскія душы / Л. Русава // Мастацтва. – 1996. – № 3. – С. 45.

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ МАКРОСОВ ДЛЯ ОПТИМИЗАЦИИ ПРОЦЕССА СОЗДАНИЯ ЧЕРТЕЖЕЙ ТРЕХМЕРНЫХ ОБЪЕКТОВ В CORELDRAW

*А.А. Варган*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

Макрос – это программный алгоритм действий, записанный пользователем. Макросы часто используются для автоматизации действий.

Многие офисные продукты и графические программы имеют функцию при обработке макроса автоматически выполнять заданную последовательность действий – нажатие клавиш, выбор пункта меню и т.п. Существует возможность записывать новые и перезаписывать существующие макросы. Используя данные утилиты, можно значительно повысить эффективность приложения. Помимо выполнения встроенного в программу набора функций, макрос позволяет обрабатывать внешние файлы, загружать и передавать файлы и данные через Интернет, читать и изменять настройки операционной системы.

В большинстве случаев macro recorder (режим записи действий пользователя в виде макроса) выводит код, который необходимо доработать. Но, тем не менее, такой макрос значительно сокращает время, необходимое для выполнения рутинных операций.